Источник: "Рэспубліка" - 2014-12-18

СПАДЧЫНА

# АДТУЛЬ, З БАЦЬКОЎСКАГА ПАРОГА...



Радок з аўтабіяграфіі народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава стаў назвай імпрэзы, прысвечанай 80-годдзю з дня яго нараджэння. Сумесную выставу «Іван Чыгрынаў. «Адтуль, з бацькоўскага парога...» арганізавалі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, дзе і адбылася падзея.

Даследчыкі і аматары мастацкага слова майстра, якія ўдзельнічалі ў імпрэзе, адзначалі, што яго творчасць — яркая старонка ў беларускай прозе. Лепшыя апавяданні і раманы пісьменніка вылучаюцца глыбокім пранікненнем ва ўнутраны свет чалавека, значнасцю пастаўленых праблем, высокім мастацкім майстэрствам. У яго творах назіраецца асаблівая прывязанасць да «малой радзімы». Пісьменнік пісаў: «Мясціны гэтыя дарагія для мяне не толькі тым, што адтуль, з бацькоўскага парога, уецца сцяжынка майго жыцця. Там, у Забесяддзі, на Магілёўшчыне, назаўсёды засталіся сляды маіх герояў, жывых і мёртвых, пра якіх я расказваю ў раманах».

Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў нарадзіўся 21 снежня 1934 года ў вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Ён належыць да пакалення, у якога вайна прыйшлася па самай светлай і радаснай пары жыцця — дзяцінстве. У сваіх творах Чыгрынаў імкнуўся паказаць праўду таго суровага і гераічнага часу, праўду, якая адкрылася яго пакаленню, узгадаванаму вайной і балючай памяццю пра яе.

На выставе прадстаўлены матэрыялы з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, сярод якіх унікальныя фотаздымкі, рукапісы, кнігі з аўтографамі, асабістыя рэчы — ручка, кішэнны гадзіннік, барсетка, акуляры — усяго каля 200 экспанатаў з ліку перададзеных у музей жонкай пісьменніка, а таксама матэрыялы з фондаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

**Дзмітрый МАХОТКІН**

Дзмітрый Махоткін. Адтуль, з бацькоўскага парога...